**Шушкевіч, У.** Рэкі жыцця / У. Шушкевіч // Лепельскі край. — 2011. — 11 студз. — С. 2.

# РЭКІ ЖЫЦЦЯ




Валодзя Трахаўцоў пазнаваць свет стаў з рэчкі Лабжанкі, якая пачыналася недзе ў Клімавіцкім раёне Магілёўшчыны і на працягу 54 кіламетраў павольна каціла воды прытокаў Сабалёўкі, Перавалачні, Бароўкі, Рэнты ў паўнаводны Сож. Як і ўсе людзі, ён вельмі цаніў сваю рэчку дзяцінства, ганарыўся ёй. Вольны час праводзіў з вудай на берагах Лабжанкі і двух вадасховішчаў, якія яна ўтварала ў родных Клімавічах. Дахаты заўсёды вяртаўся з жывымі карасямі, плоткамі, шчупакамі ў жалезным вядзерцы. Зімой коўзаўся па небяспечным, не надта трывалым лёдзе. Пазней, калі даведаўся аб існаванні энцыклапедый, перагартаў усе, якія знайшоў у раённай бібліятэцы. Шукаў пад літарай «Л» дарагую сэрцу рэчку. І, вось дзіва, знайшоў Лабжанку! На памяць вывучыў усе лічбы і факты, якія харак-тарызавалі яе параметры. Запомніў на ўсё жыццё, што рака – гэта ніякі не вадаём, як многія лічаць, а «прыродны водны паток (вадацёк), што цячэ ў выпрацаваным ім паглыбленні – пастаянным прыродным рэчышчы – і сілкуецца за лік паверхневага і падземнага сцёку з яго басейна». Як быццам спецыяльна для Лабжанкі разумныя людзі прыдумалі такое тлумачэнне!

Вадацёк жыцця Валодзі і Лабжанкі працягваўся. Хлопец сталеў, мужнеў, а Лабжанка, наадварот, занепадала – губляла моц плыні, месцамі заганялася ў канал, мутнела, зарастала, змяншаліся яе рыб-ныя запасы. Аднак рэчка засела глыбока ў сэрца Валодзю Трахаўцову як штосьці мілае, нерэальнае, легендарнее з незабыўнай казкі дзяцінства. Асабліва прыемным настальгічным успамінам зафіксавалася ў памяці Лабжанка пасля цеснага сутыкнення з другой, чужой, магутнай, можна нават сказаць, шалёнай ракой – поўнаму антыподу лагоднай Лабжанцы.

* * *

Напярэдадні новага 1980 года кіеўскую дэсантна-пераправачную роту, у якой Валодзя Трахаўцоў праходзіў тэрміновую службу, перакінулі ў Сярэднюю Азію. Сказалі – трэба наладзіць пантонную пераправу цераз Амудар´ю. Ніхто не прыдаў асаблівай значнасці незвычайнаму заданню. Меркавалі прыкладна так: на шырокім Дняпры натрэніраваліся, а што нам нейкая пустынна-горная рэчка. Як жа салдаты памыляліся ў сваіх думках!

Шырачэзны паток, утвораны сутокамі Пянджа і Вахша, на працягу 1415 кіламетраў стрымгалоў нёс густую жоўтую суспензію ў бок Аральскага мора. Толькі цяпер дэсантнікі-пантанёры зразумелі, чаму Амудар'я займае першае месца ў Цэнтральнай Азіі і адно з першых у свеце па каламутнасці – па сутнасці не ваду яна нясе, а горны сель.

Навошта пераправа цераз вялізны паток, калі раней без яе абыходзіліся? І навошта пантон з Узбекістана ў Афганістан напярэдадні 1980 года? І толькі калі па пантонным мосце несупыннай калонай рушыла савецкая ваенная тэхніка, даведаліся – пачалося ўварванне ў суседнюю краіну.

А ўзводзілася пераправа з неймавернымі праблемамі. Шалёны паток зносіў доўгую пабудову на ўсім яе працягу. Утрымлівалі яе пастаяннай буксіроўкай суп-раць плыні катэрамі і транспарцёрамі. Валодзя Трахаўцоў быў механікам транспарцёра. Змагаўся беларус з нечуваным патокам і дзіву даваўся, што ён не даходзіць да Аральскага мора – разбіраецца на арашэнне пустыні Кызылкум, з-за чаго Арал хутка памірае.

Справа зроблена! Дэсантна-пераправачную роту перакінулі з порта Хайратон на іншы ўчастак Амудар'і, на мяжу з Туркменіяй. Цяжкасці з устаноўкай і ўтрыманнем пантона паўтарыліся.

Афганістан Уладзімір Трахаўцоў пакінуў у жніўні 1980 года – дзевяць месяцаў прабыў там. Стаяў ён на беразе ціхай Лабжанкі, а ў вушах раўла і бурліла жоўтая Амудар'я.

У Клімавіцкае бюро тэхнічнай інвентарызацыі з Полацкага політэхнічнага інстытута накіравалі лепяльчанку Святлану Залатарову. Лёс звёў яе з урачом райветстанцыі Уладзімірам Трахаўцовым. Жыццё пачынаць было дзе – у прасторным доме жыла адна маці Валодзі. Можа б, і назаўсёды лепяльчанка стала клімавічанкай, калі б не 26 мая 1986 года. Дачцэ Лене тады было дзевяць месяцаў. Пачалася неразбярыха. Радыёактыўную хмару, што сунулася па небе на Маскву, «прызямлілі» над Магілёўшчынай. Частку вёсак Клімавіцкага раёна ўзяліся адсяляць. А хто паверыць, што самім Клімавічам меней дасталася смяротнай заразы?

У Лепелі пасяліліся ў старэйшых Залатаровых па Барысаўскім тракце. Яна ўладкавалася бухгалтарам на меліярацыйнае прадпрыемства, ён – ветурачом у райветстанцыю.

Збіралася Святлана быць клімавічанкай, а атрымалася так, што Уладзімір стаў лепяльчанінам. У 2002 годзе на ільготных пачатках Трахаўцовы пабудавалі кааператыўную кватэру ў Лепелі – як воін-інтэрнацыяналіст і шматдзетная сям´я: Лена цяпер працуе медсястрой ва ўрачэбнай амбулаторыі па Барысаўскім тракце, двайняты Люба і Каця навучаюцца на эколагаў у БСГА.

– Уладзімір, вы – ветурач-паразітолаг. Што гэта азначае?

– Праводжу прафілактыку і лячэнне паразітарных захворванняў жывёлы, якія выклікаюцца ўнутранымі і вонкавымі паразітамі – глістамі, кароставымі кляшчамі, вошамі, блохамі, аваднямі, што выводзяцца пад скурай...

– Што вас найбольш прыцягнула на Лепельшчыне?

– Кожны на гэта пытанне адкажа адназначна – непаўторныя азёры. Лічу, што ў маім жыцці пакінулі след навечна тры водныя аб'екты: Лабжанка, Амудар'я і Лепельскае возера. На Лабжанку не забываюся – па некалькі разоў на год езджу да хворай маці і абавязкова хаджу на спатканне з рэчкай майго маленства. Амудар'ю з памяці выкрэсліваць не хачу, аднак і сустракацца з ёй ніякага жадання не маю. А вось возера Лепельскае стала маім нязменным жыццёвым спадарожнікам. Кожную вольную хвіліну на ім праводжу з вудай. І зімой, і летам. Сёлетняй зімой самы большы

ўлоў склалі дзесяткі са тры падлешчыкаў. Аднак не па здабычу хаджу на рыбу, а дзеля бавення часу.

Нават у першы дзень новага года Уладзімір схадзіў на Лепельскае. Улоў – тры падлешчыкі. Нягледзячы на відавочную няўдачу і назаўтра пайшоў. Вынік яшчэ горшы. Сказаў, што ўвесь студзень пад лёдам будзе глуха, аднак хадзіць на возера не перастане.

**Уладзімір Шушкевіч**